*А.А.МАКАРАВА*

# КЛУБНЫЯ ЎСТАНОВЫ ЯК СУБ'ЕКТ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРЫЯРЫТЭТАЎ ДЗЯРЖАЎНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ

Як сацыяльныя інстытуты культуры клубныя ўстановы маюць значны патэнцыял для рэалізацыі асноўных мэт дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры. Яны садзейнічаюць умацаванню асноў культурнага жыцця народа з улікам таго, што дэмакратыя ў культурнай палітыцы азначае адказнасць дзяржавы за тое, каб кожнаму члену грамадства былі гарантаваныя доступ да культурнай спадчыны, магчымасць займацца культурнай дзейнасцю.

У сучасны перыяд жыцця нашага грамадства роля дзяржавы як гаранта культурнай палітыкі значна ўзрастае. Дзейнасць дзяржавы як суб'екта культурнай палітыкі накіроўваецца галоўным чынам на рэгуляванне працэсаў вытворчасці, захавання, распаўсюджвання і засваення культурных каштоўнасцей.

Безумоўна, кіраванне такой складанай і шматузроўневай сістэмай, як сфера культуры, падсістэмай якой з'яўляецца культурная сфера вольнага часу, павінна абапірацца на ўласныя законы функцыянавання. Дзяржаўнае рэгуляванне яе дзейнасці заключаецца ў садзейнічанні ўнутраным тэндэнцыям іх развіцця і забеспячэнні заканадаўча-прававой абароны на аснове выбарачнага эканамічнага стымулявання.

Нашы даследаванні дазваляюць сцвярджаць, што рэалізацыя мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыкі ў сферы культурна-асветніцкай работы на працягу апошніх гадоў XX ст. дазволіла захаваць асноўную сетку дзяржаўных клубных устаноў, забяспечыць паступовую яе стабілізацыю (рыс. 1).




*Рыс. 1.* **Дынаміка развіцця дзяржаўных клубных устаноў з 1961г. па 2000 г.**

Аналіз дзейнасці дзяржаўных клубных устаноў у гэты перыяд сведчыць, што, нягледзячы на складаныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы, установы культуры клубнага тыпу захавалі сваю жыццяздольнасць, садзейнічалі развіццю культурных ініцыятыў насельніцтва і забяспечвалі сацыяльнае рэгуляванне ў галіне народнай творчасці і клубнай работы. Галоўная ўвага клубных устаноў была накіравана на задавальненне культурных патрэбнасцей і інтарэсаў грамадзян у сферы вольнага часу, на арганізацыю самадзейнай мастацкай творчасці і культурнага адпачынку.

У краіне існуе пэўная свабода самавызначэння зместу і структуры дзейнасці клубных устаноў. У залежнасці ад грамадскіх патрэб і рэгіянальных культурных асаблівасцей могуць працаваць клубы, цэнтры, Дамы сельскай інтэлігенцыі, жывёлаводаў, дзяцей, моладзі, жанчын, пенсіянераў, майстроў музычнай культуры, фальклору, рамёстваў, цэнтры нацыянальных культур, клубы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытальні, клубы-бібліятэкі, клубы-музеі, клубы-выставы, культурна-спартыўныя, культурна-вытворчыя клубы і інш. [5, 6].

З мэтай больш рацыянальнага выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай, кадравай і фінансавай базы клубныя ўстановы могуць уваходзіць (захоўваючы пры гэтым сваю юрыдычную самастойнасць) у склад цэнтралізаваных клубных сістэм, культурных, культурна-спартыўных комплексаў, цэнтраў культуры і вольнага часу, культурна-вытворчых аб'яднанняў, іншых фарміраванняў, сумесная дзейнасць якіх рэгулюецца асобнымі статутамі і дагаворнымі адносінамі [5, с. 7—8].

Параўнальны аналіз колькасных паказчыкаў дзейнасці дзяржаўных устаноў культуры, клубных фарміраванняў, аматарскіх калектываў дастаткова поўна адлюстроўвае тыя змены і рухі, якія характарызуюць арганізацыйна-эканамічны стан галіны. Аналізуючы стан развіцця клубных устаноў дзяржаўнай сістэмы, нельга не заўважыць тэндэнцыю паступовага скарачэння іх агульнай колькасці ў 1991 – 1996 гг., калі было зачынена каля 800 устаноў клубнага тыпу. Сярод галоўных прычын гэтага працэсу трэба назваць нерэнтабельнасць утрымання клубаў у маланаселеных вёсках, адмаўленне ў фінансаванні з боку адміністрацыі калгасаў і саўгасаў, адсутнасць неабходных фінансавых сродкаў на ўтрыманне ўстаноў і адначасова недахоп кваліфікаваных спецыялістаў, немагчымасць эксплуатацыі аварыйных будынкаў і інш.

Такім чынам, сетка дзяржаўных клубных устаноў была значна рэфармавана і скарацілася амаль на 15%. Гэтая тэндэнцыя ў некаторых раёнах існуе і па сённяшні дзень. Найбольшую дынаміку працэс скарачэння ўстаноў клубнага тыпу набыў у Магілёўскай, Гродзенскай, Брэсцкай абласцях, дзе па розных прычынах была зачынена значная колькасць клубаў. Больш памяркоўна гэты працэс ажыццяўляўся на Міншчыне і Віцебшчыне.

У кожным канкрэтным выпадку скарачэнне клубных устаноў, зразумела, тлумачыцца рознымі прычынамі. Большасць ліквідаваных структур складалі клубныя ўстановы, дзе была ніжэйшая за IV групу па аплаце праца работнікаў культуры. Таму можна меркаваць, што скарачэнне сеткі клубных устаноў адбывалася з мэтай яе якаснай рэарганізацыі. А той факт, што калектывам работнікаў значнай колькасці ўстаноў (каля 400) удалося павысіць кваліфікацыйную катэгорыю і перайсці на больш высокую групу па аплаце працы, сведчыць аб актывізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці сярод насельніцтва.

Увогуле перыяд 1996—2000 гг. у цэлым па рэспубліцы вызначаецца стабілізацыяй сеткі дзяржаўных устаноў культуры, што сведчыць аб пэўных пераўтварэннях у іх дзейнасці і наяўнасці рэфармавання з улікам патрабаванняў часу. Калі за 1991—1996 гг. установы клубнага тыпу зачыняліся, то ўжо ў 1997 г. іх колькасць павялічылася на 21 установу, у тым ліку на 8 – у Брэсцкай вобласці, на 7 – у Магілёўскай, на 4 – у Віцебскай абласцях.

**Дынаміка колькасных змен дзяржаўных устаноў клубнага тыпу**

| Вобласці | 1997 г. | 2001 г. |
|---|---|---|
| Брэсцкая | 745 | 756 |
| Віцебская | 688 | 690 |
| Гомельская | 789 | 813 |
| Гродзенская | 611 | 610 |
| Магілёўская | 601 | 605 |
| Мінская | 811 | 795 |
| Г. Мінск | 1 | 1 |
| Усяго па рэспубліцы | 4246 | 4270 |

Трэба адзначыць, што 93% дзяржаўных клубных устаноў знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. Гэта ў асноўным сельскія клубы, сельскія Дамы культуры, іншыя тыпы клубных устаноў, якія займаюць трывалае месца ў сваім тэрытарыяльным асяродку, маюць пэўны арганізацыйна-творчы патэнцыял і разнастайны набор культурных паслуг для насельніцтва.

Даволі распаўсюджанымі сталі Дамы (цэнтры) фальклору, нацыянальнай культуры, маладзёжныя, эстэтычнага выхавання, клубы-бібліятэкі. Так, зараз у Беларусі налічваецца прыкладна 350 устаноў новага тыпу, адноўлены і дзейнічаюць каля 522 цэнтралізаваных клубных сістэм. Значна пашырана сетка новых устаноў традыцыйнай культуры: Дамоў (цэнтраў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рамёстваў, фальклору, народнай творчасці, народных традыцый і іншых, дзе ўвага надаецца развіццю розных формаў матэрыяльнай і духоўнай культуры[9, с. 3—15].

Згодна статыстычных даных, у 2001 г. у краіне дзейнічалі больш за 50 цэнтраў рамёстваў, з іх 17 толькі сельскіх; 34 Дамы фальклору, 40 школ народнай творчасці [3, с.3]. Цэнтры рамёстваў сталі сапраўднымі апорнымі пунктамі правядзення дзяржаўнай палітыкі нацыянальна-культурнага адраджэння на месцах. Гэта новыя ўстановы, дзейнасць якіх накіравана на захаванне і развіццё мясцовай рукатворнай народнай культуры, уздым народнай творчасці ў цэлым, раскрыццё і падтрымку унікальных талентаў. З гэтай мэтай у цэнтрах рамёстваў працуюць гурткі і студыі, дзе прадстаўнікі розных груп насельніцтва авалодваюць першаснымі навыкамі ручной працы і асновамі рамесніцкай справы.

Практыка стварэння і прафілізацыі клубных устаноў сведчыць, што іх дзейнасць дазваляе больш уважліва ставіцца да інтарэсаў грамадзян, а таксама больш рацыянальна выкарыстоўваць наяўную базу, сродкі, творчыя, інфармацыйныя і іншыя рэсурсы. Адначасова вопыт функцыянавання новых устаноў клубнага тыпу ў рэгіёнах краіны патрабуе больш дакладнага вывучэння, тэарэтычнага, прававога, інфармацыйна-метадычнага, кадравага забеспячэння. Так, наМіншчыне даволі паспяхова працуюць у сельскай мясцовасці Дом пенсіянераў, Народны дом, Дом фларыстыкі, Дом-майстэрня і інш. Віцебшчына вызначаецца значнай колькасцю Дамоў рамёстваў, якія атрымалі ў грамадстве высокую ацэнку сваёй дзейнасці.

Сярод устаноў культуры Гомельскай вобласці можна назваць Дом народнай медыцыны, клуб вясковых сустрэч, атрымалі развіццё клубы сацыяльна-культурных паслуг і інш. Ёсць прыклады пераўтварэння клубаў у новыя тыпы ўстаноў культуры на Магілёўшчыне і Гродзеншчыне. Спроба стварэння новых устаноў культуры (маладзёжных цэнтраў, цэнтраў культуры і народных традыцый) адзначаецца ў Брэсцкай вобласці.

Сярод статыстычных паказчыкаў развіцця сістэмы дзяржаўных устаноў клубнага тыпу адным з галоўных з'яўляецца колькасць аб'яднанняў самадзейнай мастацкай творчасці, таму што жыццяздольнасць сучаснага клуба вызначаецца менавіта праз культурна-творчую і канцэртна-відовішчную дзейнасць. Гэтыя пазіцыі даволі актыўна ўтрымліваюцца клубнымі ўстановамі паўсюдна па краіне. «Колькасць гурткоў і калектываў мастацкай самадзейнасці складае звыш 30 тысяч, у тым ліку 12 тысяч разнапрофільных клубных фарміраванняў для дзяцей і падлеткаў. Звыш 300 тысяч чалавек пастаянна займаюцца ў калектывах самадзейнай мастацкай творчасці. Аб высокім узроўні развіцця самадзейнай творчасці сведчыць колькасць народных і ўзорных калектываў, што працуюць пад "дахам" устаноў культуры розных ведамстваў. Іх налічваецца зараз больш за 1600» [3, с. 3]. Колькасць калектываў, якія працуюць у дзяржаўных клубных установах і маюць ганаровыя званні "ўзорны" і "народны" (а гэта асноўны паказчык іх творчага патэнцыялу), складае 820.

Пазітыўныя зрухі, што назіраюцца ў развіцці народнай творчасці, непа- срэдна звязаны з актывізацыяй у рэгіёнах канцэртна-творчай дзейнасці. Амаль у кожным раёне сіламі аматарскіх калектываў ажыццяўляецца канцэртна-філарманічная дзейнасць. Падтрымка нормаў канцэртна-філарманічнага жыцця ў раёнах патрабуе як жанравай разнастайнасці мастацкіх аб'яднанняў, так і дастаткова высокага ўзроўню іх выканальніцкага майстэрства. Стварэнне такіх арганізацый на базе існуючых клубных структур адзначаецца ў Слуцку, Маладзечне, Стоўбцах, Глыбокім і інш. Як адна з формаў паслуг насельніцтву канцэртная дзейнасць мастацкіх аб'яднанняў дазваляе ў некаторай ступені вырашаць пытанні самафінансавання клубных устаноў.

Адзначаныя пазітыўныя змены адбываюцца дзякуючы старраннай працы спецыялістаў у сферы культуры. Бясспрэчным з'яўляецца той факт, што ад узроўню прафесійнай кваліфікацыі спецыялістаў і забяспечанасці імі клубных устаноў залежаць якасць падрыхтоўкі розных сацыяльна-культурных праграм, змест і характар культурных паслуг наведвальнікам клубаў. Усяго па рэспубліцы на канец 2000 г. штат спецыялістаў клубных устаноў складаў 10304 чалавекі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Рыс. 2.* **Паказчыкі дынамікі развіцця калектываў самадзейнай мастацкай творчасці з 1938 г. па 1998 г.**

Важным кірункам у стымуляванні і развіцці самадзейнай творчасці застаюцца міжнародныя, рэспубліканскія і рэгіянальныя фестывалі.Напрыклад, у 2000 г. іх праведзена больш за 50, у ліку іх ёсць і тыя, што сталі ўжо традыцыйнымі: IV міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», у якім прынялі ўдзел больш за 500 выканаўцаў на народных інструментах; IV рэспубліканскі фестываль народнага танца “Беларуская полька”, III усебеларускі фестываль народнага гумару "Аўцюкі – 2000", міжнародны фестываль юных талентаў "Зямля пад белымі крыламі" ў г.Мазыры і інш.

Галоўным аглядам стану самадзейнай творчасці стаў першы фестываль народнага мастацтва Беларусі “Беларусь – мая песня” (1997—1998), у мера- прыемствах якога прынялі ўдзел больш за 30 тыс. калектываў розных ведам- стваў і 500 тыс. чалавек. Дынаміка развіцця калектываў мастацкай творчасці з 1938 г. па 1998 г. паказана намі на рыс. 2.

Важным творчым стымулам для мастацкіх калектываў і эфектыўнай формай прапаганды беларускага мастацтва сталі традыцыйныя фестывалі, святы, канцэрты, якія паспяхова зарэкамендавалі сябе і сталі сапраўднай візітоўкай культуры Беларусі, абласцей, рэгіёнаў рэспублікі: “Славянскі базар”, “Залаты шлягер”, “Сожскі карагод”, Усебеларускі фестываль нацыянальных культур. У іх паспяхова прымаюць удзел самадзейныя мастацкія калектывы і выканаўцы.

Пры аналізе статыстычных даных аб колькасці і разнастайнасці клубных мерапрыемстваў яскрава выяўляюцца тэндэнцыя іх арыентацыі на рэкрэацыйна-забаўляльную дзейнасць і адпачынак, укараненне розных камерцыйных праграм і праграм дыскатэк. Развіццё культурна-камерцыйных відаў і формаў работы – надзённае пытанне практыкі. Сучасны клуб набывае статус аднаго з найбольш актыўных цэнтраў фарміравання рэкрэацыйнай культуры нашага грамадства.

Перспектыўнай і развіваючай формай сацыяльна-выхаваўчай і сацыяльна-творчай работы ў сферы вольнага часу з’яўляюцца аматарскія аб’яднанні. Як сведчыць аналіз вынікаў Рэспубліканскага конкурсу аматарскіх аб’яднанняў, які адбыўся ў межах першага фестывалю народнага мастацтва краіны “Беларусь – мая песня”, у сучасны момант вопыт лепшых аб’яднанняў не толькі не абагульнены, але нават не выяўлены непасрэдна на месцах. Разам з тым самабытныя разнастайныя клубныя фарміраванні (клубы творчай інтэлігенцыі, клубы аматараў мастацтва, клубы аматараў бегу і інш.) становяцца значнай з’явай культурнага жыцця рэгіёнаў, даюць магчымасць папулярызацыі сярод насельніцтва розных формаў арганізацыі вольнага часу і відаў аматарскіх захапленняў.

Вялікая ўвага ў краіне надаецца развіццю нацыянальных культур. У Беларусі пражываюць прадстаўнікі 123 нацыянальнасцей. Многія з іх маюць свае грамадска-культурныя аб’яднанні. Створаны Цэнтр нацыянальных культур, пры якім дзейнічаюць самадзейныя нацыянальныя мастацкія калектывы, функцыянуюць нядзельныя школы, курсы па вывучэнні замежных моў. Пры ўдзеле Цэнтра праводзяцца эксперыментальныя даследаванні на месцах кампактнага пражывання прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей з мэтай вывучэння стану і перспектыў развіцця іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры. Традыцыйным стаў Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, у якім прымаюць удзел лепшыя мастацкія калектывы і выканаўцы самых розных жанраў народнай творчасці.

Колькасна-якасны аналіз дзейнасці сучасных клубных устаноў сведчыць, што, нягледзячы на сур'ёзныя фінансава-эканамічныя цяжкасці, яны выконваюць сваю сацыяльную ролю ў культурным жыцці краіны: ствараюць неабходныя ўмовы для сацыяльна-культурнай актыўнасці грамадзян, забяспечваюць працэсы захавання, стварэння і распаўсюджвання культурных каштоўнасцей. Дзейнасць клубных устаноў у значнай меры спрыяе развіццю і пашырэнню культурнай сферы вольнага часу. Ажыццяўляючы даволі актыўную работу сярод насельніцтва, мэтамі якой з'яўляюцца адпачынак, рэкрэацыя, аматарская творчасць, святочна-відовішчная дзейнасць і гульнёва-забаўляльныя зносіны, установы культуры клубнага тыпу ўсё больш запаўняюць вольны час тымі праграмамі, мерапрыемствамі, акцыямі, якія задавальняюць людзей, іх культурныя патрэбнасці і інтарэсы.

Аналіз сучасных працэсаў у дзейнасці клубных устаноў у рэгіёнах Беларусі дае падставы для вызначэння наступных напрамкаў рэфармавання клубных устаноў:

— ад клубнай установы – цэнтра ідэалагічнай работы – да клуба – цэнтра развіцця нацыянальнай культуры ва ўсіх яе відах, формах праяўлення і бытавання;

— ад клуба – уніфікаванай установы з рэгламентаваным рэжымам сацыяльна-творчай актыўнасці – да клуба – шматфункцыянальнай, мнагапрофільнай установы, прыстасаванай да ладу жыцця насельніцтва рэгіёна яе функцыянавання;

— ад клубнай установы, прызначанай фарміраваць асобу па ідэалагічным арыенціры, да ўстановы, якая стварае ўмовы для духоўнага і фізічнага станаўлення асобы ў адпаведнасці з яе самасвядомасцю, самабытнасцю і унікальнасцю;

— ад клубнай установы, што праводзіць мерапрыемствы "па святочных днях", да клуба, здольнага рэагаваць на штодзённыя клопаты і праблемы свайго асяроддзя, які можа прапанаваць кожнай сацыяльна-дэмаграфічнай, прафесіянальнай, узроставай групе набор культурных паслуг, пэўныя праграмы згодна з іх інтарэсамі і патрэбнасцямі;

— ад клуба, накіраванага на выкананне “глабальных” планаў і праграм, да клуба – сацыяльна-культурнага інстытута, які ахоўвае, падтрымлівае і распаўсюджвае нацыянальна-культурныя каштоўнасці, традыцыйныя ўзоры народнай творчасці, зберагае культурную спадчыну і садзейнічае натуральнаму існаванню нацыянальнага мастацтва і сучасных формаў мастацкай дзейнасці.

---


1. *Михайлова Л.И.* Социология культуры: Учеб. пособие. – М.: Фаир-пресс, 1999. – 232 с.

2. *Ігнатовіч П.Р.* Аб’ектыўная абумоўленасць рэгулявання сферай культуры // Чалавек. Культура. Рынак: Матэрыялы міжнар. навук. канф. – Мн.: Бел ДІПК, 2000. – С.76–79.

3. *Культура* Беларусі: стан і перспектывы развіцця. Да Рэспубліканскай нарады работнікаў культуры //Звязда. – 2001. – 30 студз. – С.3– 4.

4. *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. – 2-е выд., дап. – Мн.: Экаперспектыва, 1997. – 486 с.

5. *Нарматыўныя* матэрыялы новых тыпаў устаноў культуры. – Мн.: БелІПК, 1997. – 110 с.

6. *Нарматыўна-прававыя* дакументы па праблемах арганізацыі аматарскай творчасці. – Мн.: БелІПК, 1999. – Вып.4. – 199 с.

7. *Дзяржава* і культура. Да сустрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі з дзеячамі і работнікамі культуры /Уклад. В.М.Захарошка. — Мн.: Мінская ф-ка каляровага друку, 2001. — 240 с.

8. *Шышкін У.А.* Рэгіянальная культурная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь (асноўныя вынікі за 1997 г.) //Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навук.-інфарм. зб. /Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 1998. – Вып. 2. – С. 36—44.

9. *Боганева А.М., Смірнова І.Ю.* Вопыт работы раённых метадычных цэнтраў з аўтэнтычным фальклорам і яго носьбітамі //Інфармацыйныя матэрыялы да рэспубліканскага семінара «Новыя падыходы да праблем сельскай культуры» (Мінск, 14—15 снеж. 2000 г.). – Мн.: БелІПК, 2001. – С. 3—15.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ